КОНТРОЛЬНЫ
ЭКЗЕМПЛЯР

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
А. В. Макоўчык
« 20 » 12 2023 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-1-56/2023/вуч.

**ПАРАЎНАЛЬНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА**

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**
**1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура**

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01 – 2021 (20.04.2022, №85) і вучэбнага плана спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура 15.07.2021, №048 – 2021/у)

**СКЛАДАЛЬНІК:**
Т.М.Тарасава, прафесар кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар філалагічных навук, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Г.М.Кісліцына, загадчык аддзела тэорыі і гісторыі беларускай літаратуры філіяла «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», доктар філалагічных навук, дацэнт;
Г.К.Тычко, прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», доктар філалагічных навук, прафесар

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар
ДУА «Гімназія № 43 г. Мінска» М.Ф.Кавалеўская

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 4 ад 22.11.2023 г.)

Загадчык кафедры І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 3 ад 19.12.2023 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнагааддзела БДПУ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Параўнальнае літаратуразнаўства» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі Адукацыйнага стандарта агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01 – 2021 для спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура.

Вучэбная дысцыпліна «Параўнальнае літаратуразнаўства» адпавядае новай канцэпцыі сучаснай адукацыі і змяшчае матэрыял, які дае магчымасць студэнтам філалагічных спецыяльнасцей атрымаць комплекс ведаў пра метадалагічныя асновы беларускай літаратурна-крытычнай думкі, пра ўмовы яе станаўлення і развіцця.

Прадмет вучэбнай дысцыпліны «Параўнальнага літаратуразнаўства» вызначаецца на падставе класіфікацыі тэарэтычных праблем параўнальнага вывучэння літаратуры, а таксама праз прызму практычнага іх вырашэння. Ён асэнсоўваецца ў рэчышчы традыцыйных і сучасных пытанняў актуальнага літаратуразнаўства, што аб’ядноўвае дыскурсы агульнага і параўнальнага літаратуразнаўства.

Метадалогія параўнальнага вывучэння літаратуры дапаўняецца падыходамі, метадамі, прыёмамі, якія распрацаваны прадстаўнікамі розных літаратуразнаўчых школ і напрамкаў: міфалагічнай школай, біяграфічным метадам, культурна-гістарычным падыходам, псіхалагічнай школай, сацыялагічным падыходам, фармальным і структурным метадамі, распрацоўкамі ў рэчышчы семіётыкі, рэцэптыўнай эстэтыкі, герменеўтыкі і інш. Такім чынам, у працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны будзе ажыццяўляцца фарміраванне ўстойлівай зацікаўленасці студэнтаў да выяўлення спецыфікі літаратурных з’яў і працэсаў, вывучэння працэсаў узаемадзеяння традыцый і наватарства, даследавання адметнасцей нацыянальных літаратур у цэлым.

***Мэта*** вучэбнай дысцыпліны – раскрыць багацце, шматстайнасць, непаўторнасць сусветнай літаратуры на розных этапах яе развіцця, а таксама ў яе сувязях з літаратурным працэсам у Беларусі.

***Задачы*** вучэбнай дысцыпліны:

– навучыць студэнтаў бачыць асноўныя этапы, заканамернасці літаратурнага працэсу ў розных рэгіёнах свету, іх канкрэтна-гістарычны і «вечны» сэнс;

– сфарміраваць у студэнтаў уяўленні аб тыпалагічных адметнасцях вядучых літаратурна-мастацкіх кірункаў, плыняў, школ, што знайшлі сваё ўвасабленне ў прадстаўнікоў іншых народаў і пакаленняў;

– раскрыць сэнсавую глыбіню, шматзначнасць і непаўторнасць тых вобразаў замежных пісьменнікаў, якія набылі агульначалавечае значэнне, «новае жыццё» ў кантэксце іншанацыянальных літаратур і ў прадстаўнікоў розных пакаленняў;

– выпрацоўваць у студэнтаў навыкі выяўляць нацыянальную адметнасць і акрэсліваць агульнае ў змястоўна-фармальнай структуры твораў пісьменнікаў народаў свету.

– фарміраваць уменні і навыкі прафесійнага літаратуразнаўчага аналізу твораў мастацкай літаратуры;

– развіваць індывідуальна-творчае і аналітычнае мысленне студэнтаў;

***Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.*** Згодна з вучэбнымі планамі па спецыяльнасці

1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура» вучэбная дысцыпліна «Параўнальнае літаратуразнаўства» уваходзіць у дзяржаўны кампанент і з'яўляецца адной з асноўных дысцыплін падрыхтоўкі настаўніка-філолага.

Вучэбная дысцыпліна «Параўнальнае літаратуразнаўства» звязана з вучэбнай дысцыплінай «Гісторыя беларускай літаратуры 20-30-х гадоў XXст.» і апіраецца на паняцці, атрыманыя падчас вывучэння вучэбных дысцыплін «Сусветная літаратура XVII-XIX ст.», «Тэорыя літаратуры», якія ўваходзяць у дзяржаўны кампанент і кампанент установы вышэйшай адукацыі для спецыяльнасці 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура».

***Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Параўнальнае літаратуразнаўства» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў базавай прафесійнай кампетэнцыі БПК-20: Выкарыстоўваць сучасныя айчынныя і замежныя метадалогіі літаратуразнаўчага даследавання.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **ведаць**:

– асноўныя сучасныя літаратурныя напрамкі, плыні, школы, стылі;
– літаратурныя жанры, сродкі мастацкай выразнасці;
– тэрміны, паняцці і катэгорыі, якія характарызуюць метадалагічную парадыгму сучаснага літаратуразнаўства;
– важнейшыя сучасныя метады аналізу мастацкага твора;
– этапныя літаратуразнаўчыя працы;
– сутнасныя заканамернасці развіцця літаратурнай тэорыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **умець**:

– арыентавацца ў сучаснай літаратуры па тэорыі і метадалогіі навукі;
– аналізаваць літаратурна-крытычныя і тэарэтыка-метадалагічныя канцэпцыі з выяўленнем уласнай пазіцыі;
– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай, бібліяграфічнымі крыніцамі і сучаснымі пошукавымі сістэмамі па электронных архівах цэнтральных кнігасховішч;
– аналізаваць розныя ўзроўні мастацкага тэксту;
– выяўляць асноўныя гісторыка-тыпалагічныя і функцыянальныя разнавіднасці літаратурнай творчасці;
– суадносіць мастацкі тэкст з літаратурным напрамкам, плынню, школай, стылем.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **валодаць**:

– метадалогіяй комплекснага аналізу мастацкага тэксту;
– навыкамі аналізу мастацкага тэксту як цэласнага феномена;
– навыкамі кампаратыўна-тыпалагічнага вывучэння літаратур.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Параўнальнае літаратуразнаўства» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Асноўнымі тэхналогіямі навучання з'яўляюцца: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання; асобасна арыентаваная тэхналогія (улік індывідуальна-асобасных асаблівасцей студэнтаў, захаванне прынцыпу варыятыўнасці); інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі (мультымедыйныя прэзентацыі, online-тэсты, інтэрактыўныя заданні ў сістэмах дыстанцыйнага навучання, электронныя бібліятэкі, спецыялізаваныя сайты і інш.).

***Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, формы прамежкавай атэстацыі.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Параўнальнае літаратуразнаўства» на 3 курсе ў 6 семестры разлічана на 120 вучэбных гадзін. З іх 76 аўдыторных гадзін: 38 лекцыйных (з іх 8 гадзін адведзена на КСР), 38 практычных (з іх 8 гадзін адведзена на КСР). 44 гадзіны адведзена на самастойную работу студэнтаў. Форма адукацыі – дзённая. Форма прамежкавай атэстацыі – залік (6 семестр).

Размеркаванне гадзін па семестрах:

| **Семестр** | **Усяго** | **Лекцыі / КСРС** | **Практычныя / КСРС** | **Самастойная работа студэнтаў** | **Форма прамежкавай атэстацыі** |
|---|---|---|---|---|---|
| VI | 120 | 30/8 | 30/8 | 44 | Залік |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ 1. ГІСТОРЫКА-ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ПАРАЎНАЛЬНАГА ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

***Тэма 1.1 Параўнальнае літаратуразнаўства як навука***

Параўнальнае літаратуразнаўства (кампаратывістыка) як асобная навуковая (літаратуразнаўчая) дысцыпліна. Яе раздзелы: гісторыя, тэорыя, метадалогія кампаратывістыкі.

Месца параўнальнага літаратуразнаўства ў складзе галін літаратуразнаўства, спецыфічны прадмет кампаратывісцкага даследавання, памежная сфера з літаратуразнаўчымі дысцыплінамі. Сувязь параўнальнага літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі. Агульнае поле згісторыяй літаратуры. Тэорыя літаратуры і параўнальнае літаратуразнаўства. Месца параўнальнага літаратуразнаўства сярод іншых навуковых дысцыплін, сувязь з культуралогіяй, з гуманітарнымі навукамі, дакладнымі і прыродазнаўчымі навукамі.

Спецыфіка параўнальнага даследавання. Параўнальнае вывучэнне літаратур у гістарычнай перспектыве: паралелі з гісторыяй літаратуры (нацыянальнай / рэгіянальнай / сусветнай), асноўныя этапы ў іх развіцці, кірункі, плыні, творы ў супастаўленні і проціпастаўленні. Літаратурны працэс (сусветны і нацыянальны): міжнацыянальныя і ўнутрынацыянальныя фактары яго развіцця. Агульнанавуковыя (міждысцыплінарныя) і літаратуразнаўчыя метады (падыходы), іх суадносіны.

Роля параўнальнага літаратуразнаўства ў развіцці сучаснага літаратуразнаўства. Беларускае параўнальнае літаратуразнаўства: напрамкі, прыярытэты, набыткі на розных этапах яе развіцця, прадстаўнікі.

***Тэма 1.2. Гісторыка-тэарэтычныя праблемы параўнальнага вывучэння літаратуры***

*1.2.1. Праблемнае поле параўнальнага даследавання*

Напрамкі і школы, у межах якіх выпрацаваны метады (падыходы), прыёмы і паняцці, што складаюць яго метадалагічную аснову: эстэтыка рамантызму, антрапалагічная школа, міфалагічная школа, культурна-гістарычная школа, міграцыйная тэорыя і інш. Іншыя літаратуразнаўчыя метады і падыходы: біяграфічны, сацыялагічны, фармальны, структурны, псіхалагічны. Навуковыя дысцыпліны кампаратывісцкага плану: параўнальная фалькларыстыка, параўнальная міфалогія, параўнальна-гістарычнае мовазнаўства, параўнальнае вершазнаўства, параўнальнае літаратуразнаўства, навуковыя напрамкі і тэорыі, міждысцыплінарныя галіны ведаў (герменеўтыка, фенаменалогія, рэцэптыўная эстэтыка, семіётыка).

*1.2.2. Метадалогія параўнальнага літаратуразнаўства*

Метад яксістэма прыёмаў, спосабаў, падыходаў, з дапамогай якіх даследуюцца з’явы рэчаіснасці. Супастаўленне як спосаб вывучэння падобных з’яў. Параўнальны падыход і яго разнавіднасці ў метадалогіі літаратуразнаўства: генетычны, кантактны, тыпалагічны метады (падыходы).

*1.2.3. Кантэкстуальнае вывучэнне літаратуры*

Вывучэнне беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай і сусветнай літаратурнай класікі ў беларускім кантэксце: традыцыі, вопыт, перспектывы. Іерархічнасць, шматузроўневасць у сістэме літаратурных сувязей: гісторыка-тэарэтычныя аспекты развіцця. Асноўныя прынцыпы: храналагічны, праблемна-тэматычны, сюжэтна-вобразны, жанрава-стылявы і інш. падыходы.

***Тэма 1.3. Формы літаратурных сувязей***

*1.3.1. Паняцце пра віды літаратурных сувязей і ўзаемадзеянняў*

Паняцце пра літаратурныя сувязі і ўзаемадзеянні, літаратурны кантэкст, літаратурную класіку. Тыпалогія літаратурных сувязей і ўзаемадзеянняў.

*1.3.2. Гісторыка-генетычны (генетычны) падыход*

Гістарычная падзея як прадмет вывучэння генетычных сувязей. Гістарычная асоба (вынік жыццёвага вопыту) як прадмет вывучэння генетычных сувязей. Гістарычныя прататыпы твораў Д. Дэфо, Т. Драйзера, А. Адамовіча і інш.

*1.3.3. Кантактны падыход*

Віды (формы) літаратурных узаемадзеянняў (кантактаў, кантактных сувязей).Кантакты знешнія і ўнутраныя, прамыя і апасродкаваныя, формы міжлітаратурнай рэцэпцыі. Непасрэдныя зносіны (кантакты) паміж пісьменнікамі (знаёмствы, прысвячэнні, палеміка і інш.), паміж творцай і сатворцай (пераклад, запазычанне), паміж творцай і іншанацыянальнай / мінулым / будучым часам (іншым у прасторы і часе) рэальнасцю (творца і іншыя – тэкст, краіна, час).

Пераклад. Віды перакладу. Перакладная літаратура Беларусі.

Паняцце пра інтэртэкст і ўнутраныя фактары развіцця літаратурнага працэсу. Рэцэпцыя (наследаванне, перапрацоўка, адаптацыя).

## РАЗДЗЕЛ 2. ТЫПАЛАГІЧНЫЯ КАТЭГОРЫІ І ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС

***Тэма 2.1. Тыпалагічны падыход***

Вывучэнне літаратурных фактаў на аснове іх супастаўлення ў розных кантэкстах (дзвюх і болей нацыянальных літаратур, у межах літаратурнага кірунку, творчасці розных аўтараў). Паняцці пра тыпалогію, тыпалагічныя сыходжанні (паралелі, сувязі), пра самазараджэнне сюжэтаў, сустрэчныя плыні, сінхранію і дыяхранію, апазіцыю і інш. Тыпалагічныя сыходжанні, якія выяўляюцца пры супастаўленні ідэйна-эстэтычных пазіцый аўтараў, на сюжэтна-тэматычным узроўні, пры даследаванні родава-жанравых структур, сістэмы мастацкіх вобразаў, вобразна-выяўленчых сродкаў.  Катэгорыя літаратурнага жанру, тыпалагічнае вывучэнне жанраў.

***Тэма 2.2. Літаратурны працэс як прастора тыпалагізацыі літаратурна-мастацкіх з'яў***

Суаднесенасць гістарычных і літаратурных эпох: традыцыйная перыядызацыя сусветнага літаратурнага працэсу. Перыядызацыя сусветнай літаратуры ў адпаведнасці з чатырма перыядамі гістарычнага развіцця чалавецтва (Старажытнасць, Сярэднявечча, Новы час, Найноўшы час). Падзел сусветнага літаратурнага працэсу на сем перыядаў: Старажытнасць, Сярэднявечча і Адраджэнне, XVII і XVIII стст. (раней Новага часу), XIX ст., (літаратура Найноўшага часу) – апошняй трэці XIX – пач. XX ст., 1-й паловы XX ст. і 2-й паловы XX ст.

Сучасныя погляды на перыядызацыю сусветнага літаратурнага працэсу.

***Тэма 2.3. Літаратурныя эпохі ў тыпалагічным асвятленні***

Літаратурныя эпохі праз прызму супастаўленняў і проціпастаўленняў.

Старажытная літаратура ў кантэксце літаратуры і мастацтва Беларусі. Асноўныя формы рэцэпцыі антычнай літаратурнай спадчыныбеларускай літаратурай: біблейскія сюжэты, матывы, вобразы.Адраджэнне – пераходны перыяд у літаратуры і мастацтве. Асветніцтва – комплекс ідэй і ідэйна-культурны рух. Літаратура XIX ст. – класіка сусветнай (і беларускай) літаратуры. Літаратура XX ст.

***Тэма 2.4. Літаратурна-мастацкія кірункі, плыні, школы***

Літаратурны кірунак як паняцце агульнага і параўнальнага літаратуразнаўства. Барока. Барока ў Заходняй Еўропе і на беларускіх землях.Класіцызм: (Мальер–Дунін-Марцінкевіч). Рамантызм: агульнасусветнае і нацыянальна асаблівае. Рэалізм XIX–XX стст.: тыпалогія літаратурнага кірунку. Натуралізм. Філасофія дэкадансу і літаратура дэкадансу. Мадэрнізм: канцэпцыя чалавека і свету. Экзістэнцыялізм.

## РАЗДЗЕЛ 3. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА І ІНШАНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ЛІТАРАТУРЫЎ ПАРАЎНАЛЬНЫМ ВЫВУЧЭННІ

***Тэма 3.1. Беларуская літаратура ў кантэксце еўрапейскіх літаратур***

*3.1.1.* Паняцце пра літаратуры бліжняга замежжа, пра блізкасць культурна-гістарычнага тыпу і інш. Агульнасць гісторыка-культурнага кантэксту. Беларуска-рускія літаратурна-мастацкія сувязі.

*3.1.2.* Беларуска-еўрапейскія літаратурныя ўзаемасувязі: з гісторыі іх развіцця. Агульныя звесткі пра гісторыка-культурны лёс і літаратуру еўрапейскіх краін. Сувязі паміж беларускай і іншымі еўрапейскімі літаратурамі.

***Тэма 3.2. Мастацкі твор у параўнальным вывучэнні: літаратуразнаўчы аспект***

Літаратурны твор як сістэма. Структура літаратурнага твора з пункту гледжання фармальна-структурных кампанентаў.

Вандроўныя (традыцыйныя, класічныя) сюжэты. «Песня пра Раланда» і «Слова пра паход Ігаравы»: параўнальны аналіз. Вобраз махляра-прайдзісвета ў французскім фарсе «Мешчанін у дваранах» Ж.-П. Мальера і ў «Пінскай шляхце» В. Дуніна-Марцінкевіча. «Курган» Янкі Купалы і «Церковь иезуитов в Г.» Э.Т.А. Гофмана: да праблемы тыпалагічных сыходжанняў.

***Тэма 3.3. Мастацкі твор у параўнальным вывучэнні: культуралагічны аспект***

Сувязь мастацтва слова з іншымі відамі мастацтва. Літаратура і музыка. Літаратура і выяўленчае мастацтва. Літаратура і тэатр. Літаратура і кіно.

## РАЗДЗЕЛ 4. ПРАБЛЕМА АЎТАРА ПРАЗ ПРЫЗМУ ПАРАЎНАЛЬНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

***Тэма 4.1. Праблема аўтара ў сучасным літаратуразнаўстве***

Паняцці пра біяграфічнага аўтара і аўтара ва ўнутрытэкставым увасабленні. Жыццёвы шлях пісьменніка і яго алгарытм як аснова кантэкстуальнага вывучэння літаратуры. Навуковая літаратура і мастацкая літаратура пра выдатную асобу творцы.Багдановічазнаўства. Коласазнаўства. Купалазнаўства.

***Тэма 4.2. Творцы«першай велічыні» ў сусветнай і нацыянальнай літаратурах***

Дантэ: старонкі жыццёвага і творчага шляху, тыпалагічныя сыходжанні са старонкамі жыццяпісу пісьменнікаў народаў свету. Асноўныя этапы жыццёвага і творчага шляху. Д.Г. Байран и рамантызм. П. Верлен і імпрэсіянізм. Імпрэсіянізм у паэзіі М. Багдановіча. Бальзак і яго ўплыў на развіццё сусветнай культуры. Бальзакаўскія традыцыі ў беларускім рамане (К. Чорны і інш.). Якуб Колас і Янка Купала. Уладзімір Караткевіч. Васіль Быкаў. Максім Танк. Аркадзь Куляшоў.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ «ПАРАЎНАЛЬНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА»

(дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Самастойная работа студэнта | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | Кіруемая самастойная работа студэнта | | | | | |
| | | | | Лекцыі | Практыч. зан. | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | **Параўнальнае літаратуразнаўства** | **30** | **30** | **8** | **8** | **44** | | | |
| **1.** | **ГІСТОРЫКА-ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ПАРАЎНАЛЬНАГА ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА** | **8** | **8** | **2** | **2** | **10** | | | |
| ***1.1*** | ***Параўнальнае літаратуразнаўства як навука*** | **2** | **2** | | | **4** | | | |
| | 1. Параўнальнае літаратуразнаўства (кампаратывістыка) як асобная навуковая (літаратуразнаўчая) дысцыпліна.<br>2. Месца параўнальнага літаратуразнаўства ў складзе галін літаратуразнаўства, прадмет даследавання, памежная сфера з кожнай з літаратуразнаўчых дысцыплін.<br>3. Параўнальнае вывучэнне літаратур у гістарычнай перспектыве.<br>4. Літаратурны працэс (сусветны і нацыянальны): міжнацыянальныя і ўнутрынацыянальныя фактары яго развіцця.<br>5. Роля параўнальнага літаратуразнаўства ў развіцці сучаснага літаратуразнаўства.<br>6. Беларуская кампаратывістыка: напрамкі, прыярытэты, набыткі на розных этапах яе развіцця, прадстаўнікі. | 2 | 2 | | | 4 | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў | Асн.: [1], [2], [5] Дад.: [1], [7] | Вусная праверка ведаў, кантрольнае апытванне. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ***1.2.*** | ***Гісторыка-тэарэтычныя праблемы параўнальнага вывучэння літаратуры*** | **2** | **2** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 1.2.1 | *Праблемнае поле параўнальнага даследавання*<br>1. Напрамкі і школы, у межах якіх выпрацаваны метады, прыёмы і паняцці, што складаюць метадалагічную аснову: эстэтыка рамантызму, антрапалагічная школа, міфалагічная школа іінш.<br>2. Іншыя літаратуразнаўчыя метады і падыходы: біяграфічны, сацыялагічны, фармальны, структурны, псіхалагічны.<br>3. Навуковыя дысцыпліны кампаратывісцкага плану: галіны, раздзелы ў пэўных навуках, навуковыя напрамкі і тэорыі, міждысцыплінарныя галіны ведаў. | 1 | | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў | Асн.: [1], [2], Дад.: [1], [7] | |
| 1.2.2 | *Метадалогія параўнальнага літаратуразнаўства*<br>1. Метад як сістэма прыёмаў, спосабаў, падыходаў у той ці іншай навуцы, з дапамогай якіх даследуюцца з'явы рэчаіснасці.<br>2. Супастаўленне як спосаб вывучэння падобных з'яў шляхам іх простага супастаўлення.<br>3. Наяўнасць рознаўзроўневых сістэм параўнальнага вывучэння. Параўнальны метад / падыход (кампаратывізм) – адзін з асноўных агульнанавуковых метадаў / падыходаў.<br>4. Параўнальны падыход і яго разнавіднасці: генетычны, кантактны, тыпалагічны метады (падыходы). | 1 | | 2 | | | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў | Асн.: [1], [5], Дад.: [7] | Вусная праверка ведаў, кантрольнае апытванне. |
| 1.2.3 | *Кантэкстуальнае вывучэнне літаратуры*<br>1. Вывучэнне беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай і сусветнай літаратурнай класікі ў беларускім кантэксце: традыцыі, вопыт, перспектывы.<br>2. Іерархічнасць, шматузроўневасць у сістэме літаратурных сувязей: гісторыка-тэарэтычныя аспекты развіцця. Асноўныя прынцыпы.<br>3. Асноўныя прынцыпы: храналагічны, праблемна-тэматычны, сюжэтна-вобразны, жанрава-стылявы і інш. падыходы. | | 2 | | 2 | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў | Асн.: [1], [2], [5] Дад.: [7] | Вусная праверка ведаў, кантрольнае апытванне. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.3** | ***Формы літаратурных сувязей*** | **4** | **4** | | | **2** | | | |
| 1.3.1 | *Паняцце пра віды літаратурных сувязей і ўзаемадзеянняў*<br>1. Паняцце пра літаратурныя сувязі і ўзаемадзеянні, літаратурны кантэкст, літаратурную класіку.<br>2. Тыпалогія літаратурных сувязей і ўзаемадзеянняў. | 2 | | | | | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў | Асн.: [1], [5], Дад.: [7] | |
| 1.3.2 | *Гісторыка-генетычны (генетычны) падыход*<br>1. Гістарычная падзея як прадмет вывучэння генетычных сувязей.<br>2. Гістарычная асоба як прадмет вывучэння генетычных сувязей.<br>3. Гістарычныя прататыпы твораў Д. Дэфо, Т. Драйзера, А. Адамовіча і інш. | 2 | 2 | | | | | Асн.: [1], [4], Дад.: [2], [3] | Вусная праверка ведаў, кантрольнае апытванне. |
| 1.3.3 | *Кантактны падыход*<br>1. Віды (формы) літаратурных узаемадзеянняў (кантактаў, кантактных сувязей).<br>2. Кантакты знешнія і ўнутраныя, прамыя і апасродкаваныя, формы міжлітаратурнай рэцэпцыі.<br>3. Пераклад. Віды перакладу. Перакладная літаратура Беларусі.<br>4. Паняцце пра інтэртэкст і ўнутраныя фактары развіцця літаратурнага працэсу.<br>5. Віды рэцэпцыі. | | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў | Асн.: [5], Дад.: [4], [6] | Экспрэс-апытанне |
| **2.** | **ТЫПАЛОГІЧНЫЯ КАТЭГОРЫІ І ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС** | **6** | **6** | **2** | **2** | **10** | | | |
| ***2.1.*** | ***Тыпалагічны падыход*** | **2** | **2** | | | **2** | | | |
| | 1. Вывучэнне літаратурных фактаў на аснове іх супастаўлення ў розных кантэкстах (дзвюх і болей нацыянальных літаратур, у межах літаратурнага кірунку, творчасці розных аўтараў).<br>2. Паняцці пра тыпалогію, тыпалагічныя сыходжанні (паралелі, сувязі), пра самазараджэнне сюжэтаў, сустрэчныя плыні, сінхранію і дыяхранію, апазіцыю і інш. | 2 | | | | | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў. Відэафрагменты мастацкіх | Асн.: [1], [4], [5] Дад.: [1], | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3.Тыпалагічныя сыходжанні, якія выяўляюцца пры супастаўленні ідэйна-эстэтычных пазіцый аўтараў, на сюжэтна-тэматычным узроўні, пры даследаванні родава-жанравых структур, сістэмы мастацкіх вобразаў, вобразна-выяўленчых сродкаў.<br>4. Катэгорыя літаратурнага жанру, тыпалагічнае вывучэнне жанраў. | | 2 | | | 2 | фільмаў | [6] | |
| ***2.2*** | ***Літаратурны працэс як прастора тыпалагізацыі літаратурна-мастацкіх з'яў*** | **2** | **2** | | | **4** | | | |
| | 1. Суаднесенасць гістарычных і літаратурных эпох: традыцыйная перыядызацыя сусветнага літаратурнага працэсу.<br>2. Перыядызацыя сусветнай літаратуры ў адпаведнасці з чатырма перыядамі гістарычнага развіцця чалавецтва (Старажытнасць, Сярэднявечча, Новы час, Найноўшы час).<br>3. Сучасныя погляды на перыядызацыю сусветнага літаратурнага працэсу. | 2 | 2 | | | 4 | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў | Асн.: [2], [4, [5]<br>Дад.: [1], [7] | Напісанне дакладаў |
| ***2.3*** | ***Літаратурныя эпохі ў тыпалагічным асвятленні*** | **1** | **1** | **2** | | **2** | | | |
| | 1. Літаратурныя эпохі праз прызму супастаўленняў і проціпастаўленняў.<br>2. Старажытная літаратура ў кантэксце літаратуры і мастацтва Беларусі.Сярэднявечча – новая гістарыка-культурная эпоха.<br>3. Асноўныя формы рэцэпцыі антычнай літаратурнай спадчыны беларускай літаратурай: біблейскія сюжэты, матывы, вобразы.<br>4. Адраджэнне – пераходны перыяд у літаратуры і мастацтве.<br>5. Асветніцтва – комплекс ідэй і ідэйна-культурны рух.<br>6. Літаратура XIX ст. – класіка сусветнай (і беларускай) літаратуры.<br>7. Літаратура XX ст. | 1 | 1 | 2 | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў. Відэафрагменты мастацкіх фільмаў | Асн.: [1], [2],<br>Дад.: [1], [3] | Вусная праверка ведаў, кантрольнае апытванне. |
| ***2.4*** | ***Літаратурна-мастацкія кірункі, плыні, школы*** | **1** | **1** | | **2** | **2** | | | |
| | 1. Літаратурны кірунак як паняцце агульнага і параўнальнага літаратуразнаўства. | 1 | | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя, | Асн.: [1], | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Барока. Дваістасць чалавека і свету. Барока ў Заходняй Еўропе і на беларускіх землях.<br>3. Класіцызм: літаратурны кірунак і сістэма гісторыка-культурнага развіцця.<br>4. Рамантызм: агульнасусветнае і нацыянальна асаблівае.<br>5. Рэалізм. Літаратура рэалізму ў XIX ст.: тыпалогія літаратурнага кірунку. Натуралізм.<br>8. Філасофія дэкадансу і літаратура дэкадансу.<br>9. Мадэрнізм: канцэпцыя чалавека і свету.<br>10. Экзістэнцыялізм. | | 1 | | 2 | | мастацкія тэксты твораў. Відэафрагменты мастацкіх фільмаў | [2], [3], [5] Дад.: [2], [3] | Падрыхтоўка і абарона дакладаў |
| **3.** | **БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА І ІНШАНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ЛІТАРАТУРЫ** | **8** | **8** | **2** | **2** | **12** | | | |
| ***3.1*** | ***Беларуская літаратура ў кантэксце еўрапейскіх літаратур*** | **2** | **2** | **2** | | **4** | | | |
| 3.1.1 | 1. Паняцце пра літаратуры бліжняга замежжа, пра блізкасць культурна-гістарычнага тыпу і інш.<br>2. Агульнасць гісторыка-культурнага кантэксту. Беларуска-рускія літаратурна-мастацкія сувязі.<br>3. Агульнасць гісторыка-культурнага лёсу славянскага свету. | 1 | 1 | 2 | | | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў | Асн.: [1], [2], Дад.: [5], [6] | Падрыхтоўка паведамлення ў |
| 3.1.2 | 4. Беларуска-еўрапейскія літаратурныя ўзаемасувязі: з гісторыі іх развіцця.<br>5. Сувязі паміж беларускай і нямецкай літаратурамі.<br>6. Сувязі паміж беларускай і французскай літаратурамі.<br>7. Сувязі паміж беларускай і англійскай літаратурамі.<br>8. Сувязі паміж беларускай і іншымі еўрапейскімі літаратурамі. | 1 | 1 | | | 4 | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў | Асн.: [1], [2], [5] Дад.: [1], [7] | Экспрэс-апытанне |
| ***3.2*** | ***Мастацкі твор у параўнальным вывучэнні: літаратуразнаўчы аспект*** | **2** | **4** | | **2** | **6** | | | |
| | 1. Літаратурны твор як сістэма.<br>2. Структура літаратурнага твора з пункту гледжання фармальна-структурных кампанентаў. | 2 | | | | 6 | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія | Асн.: [1], [5], | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Вандроўныя (традыцыйныя, класічныя) сюжэты.<br>4. «Песня пра Раланда» і «Слова пра паход Ігаравы»: параўнальны аналіз.<br>5. Вобраз махляра-прайдзісвета ў французскім фарсе «Мешчанін у дваранах» Ж.-П. Мальера і ў «Пінскай шляхце» В. Дуніна-Марцінкевіча.<br>6. «Курган» Янкі Купалы і «Церковь иезуитов в Г.» Э.Т.А. Гофмана: да праблемы тыпалагічных сыходжанняў. | | 2<br>2 | | 2 | | тэксты твораў. Відэафрагменты мастацкіх фільмаў | Дад.: [4], [6] | Падрыхтоўка прэзентацый |
| ***3.3.*** | ***Мастацкі твор у параўнальным вывучэнні: культуралагічны аспект*** | **4** | **2** | | | **2** | | | |
| | 1. Сувязь мастацтва слова з іншымі відамі мастацтва.<br>2. Літаратура і музыка.<br>3. Літаратура і выяўленчае мастацтва.<br>4. Літаратура і тэатр.<br>5. Літаратура і кіно. | 4 | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў | Асн.: [1], [2], [5] Дад.: [1], [7] | Напісанне эсэ «Беларуская і амерыканская фантастыка» |
| **4.** | **ПРАБЛЕМА АЎТАРА ПРАЗ ПРЫЗМУ ПАРАЎНАЛЬНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ** | **8** | **8** | **2** | **2** | **12** | | | |
| ***4.1*** | ***Праблема аўтара ў сучасным літаратуразнаўстве*** | **2** | **4** | | | **6** | | | |
| | 1. Паняцці пра біяграфічнага аўтара і аўтара ва ўнутрытэкставым увасабленні.<br>2. Жыццёвы шлях пісьменніка і яго алгарытм як аснова кантэкстуальнага вывучэння літаратуры.<br>3. Навуковая літаратура і мастацкая літаратура пра выдатную асобу творцы.<br>4. Багдановічазнаўства. Коласазнаўства. Купалазнаўства. | 2 | 4 | | | 6 | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія тэксты твораў | Асн.: [1], [3], Дад.: [2], [5] | Вусная праверка ведаў, кантрольнае апытванне. |
| ***4.2*** | ***Творцы «першай велічыні» ў сусветнай і нацыянальнай літаратурах*** | **6** | **4** | **2** | **2** | **6** | | | |
| | 1. Дантэ: старонкі жыццёвага і творчага шляху, тыпалагічныя сыходжанні са старонкамі жыццяпісу пісьменнікаў народаў свету. Асноўныя этапы жыццёвага і творчага шляху. | 6 | | | | 6 | Мультымедыйная прэзентацыя, мастацкія | Асн.: [1], [2], | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Д.Г. Байран и рамантызм.<br>3. Бальзак і яго ўплыў на развіццё сусветнай культуры. Бальзакаўскія традыцыі ў беларускім рамане (К. Чорны і інш.).<br>4. П. Верлен і імпрэсіянізм.<br>5. М. Багдановіч і П. Верлен: дзве творчыя асобы, два мастацкія светы. Імпрэсіянізм у паэзіі М. Багдановіча.<br>6. Якуб Колас і Янка Купала.<br>7. Уладзімір Караткевіч. Васіль Быкаў.<br>8. Максім Танк. Аркадзь Куляшоў. | | 4 | 2 | 2 | | тэксты твораў. Відэафрагменты мастацкіх фільмаў | [5]<br>Дад.:<br>[1],<br>[4] | Гутарка, напісанне эсэ |
| | **УСЯГО** | **30** | **30** | **8** | **8** | **44** | | | **ЗАЛІК** |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Гісторыя беларускай літаратуры [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)» / склад.: Т. У. Ганчарова-Цынкевіч [і інш.] // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/43707. – Дата доступу: 24.11.2023.

2. История зарубежной литературы (история зарубежной литературы XIX века) [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс для специальностей 1-02 03 02 «Русский язык и лититература», 1-02 03 04 «Русский язык и литература. Иностранный язык (с указанием языка)» / сост. Т. Е. Комаровская // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: http://elib.bspu.by/handle/doc/2136. – Дата доступа: 24.11.2023.

3. История зарубежной литературы XX века : пособие для студентов вузов / сост. Л. Н. Сержант. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т, 2018. – 148 с.

4. Сусветны літаратурны працэс [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)» / склад. Т. М. Тарасава // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/43715. – Дата доступу: 24.11.2023.

**Дадатковая літаратура**

1. Адамовіч, Г. Я. Літаратурная класіка ў параўнальным вывучэнні : дапаможнік / Г. Я. Адамовіч. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2009. – 179 с.

2. История зарубежной литературы XX века : програм.-метод. материалы для студентов филол. фак. / Белорус. гос. пед. ун-т ; сост. Н. Л. Сержант. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т, 2018. – 148 с.

3. Леонова, Е. А. Немецкая литература XX века. Германия. Австрия : учеб. пособие / Е. А. Леонова. – М. : Флинта, 2010. – 353 с.

4. Лявонава, Е. Агульнае і адметнае: творы беларускіх пісьменнікаў XX стагоддзя ў кантэксце сусветнай літаратуры : дапам. для настаўнікаў / Е. А. Лявонава. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 200 с.

5. Мацюхіна, Т. Б. Беларускі імпрэсіянізм / Т. Б. Мацюхіна. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 202 с.

6. Минералов, Ю. И. Сравнительное литературоведение (компаративистика) : учеб. для бакалавриата и магистратуры / Ю. И. Минералов. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Юрайт, 2019. – 328 с.

7. Шаблоўская, І. Сусветная літаратура ў беларускай прасторы: рэцэпцыя, тыпалогія, кантакты / І. Шаблоўская. – Мінск : Радыёла-плюс, 2007. – 302 с.

8. Шайтанов, И. О. Компаративистика и/или поэтика: английские сюжеты глазами исторической поэтики / И. О. Шайтанов. – М. : Рос. гос. гуманитар. ун-т, 2010. – 659 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННЮ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Мэтай самастойнай работы з’яўляецца авалоданне асноўнымі навыкамі і ўменнямі для выканання самастойнай работай. Пры выкананні самастойнай работы павінны быць створаныя ўмовы, пры якіх будзе забяспечана актыўная роля студэнтаў у самастойным атрыманні ведаў і сістэматычным выкарыстанні іх на практыцы.

Задачамі кіруемай работы студэнтаў з'яўляюцца:

– актывізацыя вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне ўменняў і навыкаў самастойнага авалодання ведамі;

– фарміраванне ўменняў і навыкаў самастойнага прымянення ведаў на практыцы;

– самаразвіццё і самаўдасканаленне.

Кантроль самастойнай работы можа ажыццяўляцца ў выглядзе тэстаў, абмеркавання рэфератаў, абмеркавання і абароны вучэбных заданняў, экспрэс-апытанняў на аўдыторных занятках, калёквіумаў.

## ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ І КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на СРС | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1.1 | Параўнальнае літаратуразнаўства як навука | 4 | Вывучыць тэарэтычны матэрыял, прачытаць неабходныя крытычныя тэксты. | Вусная праверка атрыманых ведаў, кантрольныя пытанні, тэсціраванне ў ў СДН MOODLE. |
| 1.2 | Гісторыка-тэарэтычныя праблемы параўнальнага вывучэння літаратуры | 4 | Вывучыць тэарэтычны матэрыял, узнавіць веды, атрыманыя на дысцыплінах «Сусветны літаратурны працэс», «Уводзіны ў літаратуразнаўства», «Гісторыя беларускай літаратуры» (прынцыпы аналізу мастацкага твора), ахарактарызаваць метадалогію антрапалагічнай школы. | Вусная праверка атрыманых ведаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 1.3 | Формы літаратурных сувязей | 2 | Вывучыць тэарэтычны матэрыял, прачытаць неабходныя крытычныя тэксты, вызначыць разнавіднасці параўнальнага падыходу. | Вусная праверка атрыманых ведаў, індывідуальная гутарка, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 2.1 | Тыпалагічны падыход | 2 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя крытычныя тэксты. Узнавіць веды, атрыманыя на дысцыпліне «Гісторыя беларускай літаратуры» . | Вусная праверка атрыманых ведаў, індывідуальная гутарка, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 2.2 | Літаратурны працэс як прастора тыпалагізацыі літаратурна-мастацкіх з’яў | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя крытычныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных літаратурна-крытычных матэрыялаў, кіруючыся метадычнымі парадамі. | Вусная праверка атрыманых ведаў, праверка рэферата, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2.3 | Літаратурныя эпохі ў тыпалагічным асвятленні | 2 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя крытычныя тэксты.<br>Выканаць аналіз твораў (на выбар) прапанаваных аўтараў, кіруючыся метадычнымі парадамі. | Вусная праверка атрыманых ведаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 2.4 | Літаратурна-мастацкія кірункі, плыні, школы | 2 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя крытычныя тэксты.<br>Падрыхтаваць вусныя выказванні па тэме:<br>1. М. Багдановіч і культурна-гістарычная школа. | Вусная праверка атрыманых ведаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 3.1 | Беларуская літаратура ў кантэксце еўрапейскіх літаратур | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя крытычныя тэксты. | Вусная праверка атрыманых ведаў, праверка чытацкіх дзённікаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 3.2 | Мастацкі твор у параўнальным вывучэнні: літаратуразнаўчы аспект | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя крытычныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных літаратурна-крытычных матэрыялаў, кіруючыся метадычнымі парадамі. | Вусная праверка атрыманых ведаў, праверка чытацкіх дзённікаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 3.3 | Мастацкі твор у параўнальным вывучэнні: культуралагічны аспект | 2 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя крытычныя тэксты.<br>Падрыхтаваць паведамленні па тэме:<br>1. Літаратура і выяўленчае мастацтва. | Вусная праверка атрыманых ведаў, праверка чытацкіх дзённікаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 4.1 | Праблема аўтара ў сучасным літаратуразнаўстве | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя крытычныя тэксты.<br>Выканаць аналіз прапанаваных твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Самастойна пазнаёміцца з творчасцю С. Полацкага праз прызму эстэтыкі барока, зрабіць анатаванне некалькіх | Вусная праверка атрыманых ведаў, праверка чытацкіх дзённікаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | твораў у чытацкім дзённіку.<br>Параўнаць натуралістычныя прыёмы ў творах Э. Заля і М. Гарэцкага («НА імперыялістычнай вайне») | |
| 4.2 | Творцы «першай велічыні» ў сусветнай і нацыянальнай літаратурах | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, выканаць аналіз прапанаваных перакладных твораў, кіруючыся метадычнымі парадамі.<br>Падрыхтаваць вусныя выказванні па тэмах (на выбар студэнта):<br>1. Асноўныя этапы жыццёвага і творчага шляху Дантэ;<br>2. Д.Г. Байран и рамантызм;<br>3.Уладзімір Караткевіч і Васіль Быкаў – знакавыя постаці ў нацыянальнай літаратуры.<br>4. Максім Танк і Аркадзь Куляшоў – дзве творчыя асобы, два мастацкія светы. | Вусная праверка атрыманых ведаў, праверка чытацкіх дзённікаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| | **Усяго за VI семестр** | **44** | | |

## ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ І КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на КСРС | | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекц. 8 | практ. 8 | | |
| | | | | **VI семестр** | |
| 1.2.2 | ***Метадалогія параўнальнага літаратуразнаўства*** | 2 | | Заданне:<br>1) 1 модуль складанасці: зрабіць табліцу «Наяўнасць рознаўзроўневых сістэм параўнальнага вывучэння. Параўнальны метад / падыход (кампаратывізм) – адзін з асноўных агульнанавуковых метадаў / падыходаў» на аснове лекцыйнага матэрыялу і дадатковай літаратуры;<br>2) 2 модуль складанасці: падрыхтаваць рэферат на тэму «Супастаўленне як спосаб вывучэння падобных з'яў шляхам іх простага супастаўлення»;<br>3) 3 модуль складанасці: падрыхтаваць міні-даследаванне па тэме «Параўнальны падыход у вывучэнні творчасці Я. Купалы». | Праверка зробленых схем, запоўненых табліц, рэфератаў, міні-даследаванняў. |
| 1.2.3 | ***Кантэкстуальнае вывучэнне літаратуры*** | | 2 | Заданне:<br>1) 1 модуль складанасці: заканспектаваць адну з рэцэнзій на зборнікі «Песні-жальбы» Я. Коласа і «Гусляр» Я. Купалы;<br>2) 2 модуль складанасці: падрыхтаваць рэферат па тэме «Літаратурна-крытычная дзейнасць Я. Лёсіка»;<br>3) 3 модуль складанасці: зрабіць самастойны цэласны аналіз літаратурна-крытычнай публікацыі Гмырака Л. «Яшчэ раз аб сплочванні доўгу».<br>– | Праверка канспектаў, рэфератаў, індывідуальны разбор выкананага пісьмовага аналізу арыкулаў. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 2.3 | ***Літаратурныя эпохі ў тыпалагічным асвятленні*** | 2 | | Заданне:<br>1) 1 модуль складанасці: скласці табліцу перыядызацыі эпохі Адраджэння;<br>2) 2 модуль складанасці: падрыхтаваць даклад на тэму «Рэнесансная канцэпцыя чалавека»;<br>3) 3 модуль складанасці: аформіце і абараніце прэзентацыю па тэме «Вобраз жанчыны ў літаратуры французскага Адраджэння». | Праверка канспектаў, рэфератаў, індывідуальны разбор выкананага пісьмовага аналізу арыкулаў. |
| 2.4 | ***Літаратурна-мастацкія кірункі, плыні, школы*** | | 2 | Заданне:<br>1) 1 модуль складанасці: складзіце спіс ключавых пісьменнікаў мадэрністаў у сусветнай літаратуры;<br>2) 2 модуль складанасці: падрыхтуйце даклад па творчасці Г. Апалінэра;<br>3) 3 модуль складанасці: прааналізуйце мадэрнісцкія рысы ў творчасці М. Багдановіча | Праверка зробленых схем, запоўненых табліц, рэфератаў, міні-даследаванняў. |
| 3.1 | ***Беларуская літаратура ў кантэксце еўрапейскіх літаратур*** | 2 | | Заданне:<br>1) 1 модуль складанасці: законспектуйце артыкул Я. Коласа «Памяці Анры Барбюса» (1935);<br>2) 2 модуль складанасці: падрыхтуйце даклад па тэме «А. Барбюс і Першая сусветная вайна»;<br>3) 3 модуль складанасці: зрабіце супастаўляльны аналіз творчасці М. Гарэцкага і А. Барбюса аб Першай сусветнай вайне. | Праверка канспектаў, рэфератаў, індывідуальны разбор выкананага пісьмовага аналізу арыкулаў. |
| 3.2 | ***Мастацкі твор у параўнальным вывучэнні: літаратуразнаўчы аспект*** | | 2 | Заданне:<br>1) 1 модуль складанасці: сістэматызуйце асноўныя рысы вобраза мастака ў паэме Янкі Купалы «Курган»;<br>2) 2 модуль складанасці: падрыхтуйце даклад на тэму «Вобраз мастака і мастацтва ў творчасці Э.Т.А. Гофмана»;<br>3) 3 модуль складанасці: падрыхтуйце рэферат: «Курган» Янкі Купалы і «Церковь иезуитов в Г.» Э.Т.А. Гофмана: да праблемы тыпалагічных сыходжанняў. | Праверка канспектаў, рэфератаў, індывідуальны разбор выкананага пісьмовага аналізу арыкулаў. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 4.2 | ***Творцы «першай велічыні» ў сусветнай і нацыянальнай літаратурах*** | 2 | | Заданне:<br>1) 1 модуль складанасці: Вызначце старонкі жыццёвага і творчага шляху Дантэ;<br>2) 2 модуль складанасці: зрабіце прэзентацыю «Боскай камедыі» Дантэ;<br>3) 3 модуль складанасці: складзіце табліцу тыпалагічных сыходжанняў творчага шляху Дантэ са старонкамі жыццяпісу Ф. Скарыны. | Праверка канспектаў, рэфератаў, індывідуальны разбор выкананага пісьмовага аналізу арыкулаў. |
| 4.2 | ***Творцы «першай велічыні» ў сусветнай і нацыянальнай літаратурах*** | | 2 | Заданне:<br>1) 1 модуль складанасці: скласці канспект кнігі М. Тычыны «Філасофія літаратуры. Беларускі варыянт (2014);<br>2) 2 модуль складанасці: падрыхтаваць выступленне «Творчасць Васіля Быкава ў кантэксце сусветнай літаратуры пра вайну»;<br>3) 3 модуль складанасці: напісаць эсэ «Максім Багдановіч як класічны прадстаўнік паэзіі «чыстай красы». | Праверка канспектаў, рэфератаў, індывідуальны разбор выкананага пісьмовага аналізу арыкулаў. |

# ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для бягучага кантролю і самакантролю ведаў і ўменняў студэнтаў па дысцыпліне «Параўнальнае літаратуразнаўства» можна выкарыстоўваць наступны дыягнастычны інструментарый:

– правядзенне прамежкавых апытанняў па асобных тэмах;

– правядзенне тэсціравання ў СДН MOODLE;

– індывідуальная гутарка са студэнтам;

– візуальная праверка выкананых даследчых і творчых заданняў;

– ацэньванне абароны падрыхтаваных паведамленняў, рэфератаў, вусных прэзентацый;

– праверка наяўнасці чытацкага дзённіка з тэзісамі літаратурна-крытычных матэрыялаў;

– даследаванне ўзроўню і вызначэнне якасці аналітычнай апрацоўкі літаратурна-крытычнага матэрыялу праз вусныя або пісьмовыя выступленні студэнтаў.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

1. Параўнальнае літаратуразнаўства як дысцыпліна.
2. Месца параўнальнага літаратуразнаўства сярод іншых дысцыплін і галін літаратуразнаўства.
3. Этапы развіцця сусветнай кампаратывістыкі.
4. Параўнальнае літаратуразнаўства на Беларусі.
5. Параўнальна-гістарычны метад ў літаратуразнаўстве: этапы станаўлення, навуковыя школы.
6. «Міфалагічная школа» і яе роля ў развіцці кампаратывістыкі.
7. Асноўныя прынцыпы кампаратывісцкага даследавання ў працах А.М. Весялоўскага.
8. Кантактныя сувязі, іх віды ў кампаратывістыцы.
9. Тыпалагічны падыход у літаратуразнаўстве.
10. Мастацкі пераклад і яго функцыі.
11. Літаратурныя жанры: міждысцыплінарны кантэкст (на прыкладзе навелы).
12. Літаратурныя кірункі ў параўнальным вывучэнні. Сімвалізм. Імпрэсіянізм.
13. Тэкст і твор. «Чужое» слова ў тэксце. Інтэртэкстуальнасць.
14. Паняцце *мастацкі вобраз* у літаратуры.
15. Паняцце *тыповы вобраз* у літаратуры.
16. Вобраз-персанаж і яго мастацкая роля ў літаратуры.
17. Складнікі вобраза-персанажа ў мастацкім творы.
18. Паняцце *матыў/лейтматыў* у літаратуры. Разнастайнасць матываў у літаратуры.
19. Сімвалісцкае светабачанне М. Багдановіча і П. Верлена (2-3 вершы на выбар).
20. Імпрэсіяністычны малюнак у вершах М. Багдановіча і П. Верлена (2-3 вершы на выбар).
21. Літаратурная класіка ў параўнальным вывучэнні: Г. дэ Мапасан «Каралі» і Г. Ібсэн «Лялечны дом» (на узроўні праблем твораў).
22. Літаратурная класіка ў параўнальным вывучэнні (на ўзроўні вобразнай сістэмы твораў (творы на выбар)).
23. Аналіз паэтычных перакладаў з беларускай на рускую мову і наадварот (2 вершы на выбар).
24. Інтэртэкстуальныя ўключэнні, іх функцыі ў мастацкім тэксце (2 творы на выбар).
25. Літаратурны твор у кінематографе (А. Адамовіч «Нямко» – фільм «Франц + Паліна»).
26. Жанр навелы Адраджэння і ў Г. дэ Мапасана (творы на выбар).
27. Жанр навелы ў А. Гаруна і У. Сцяпана (творы на выбар).
28. Параўнальны аналіз вобразаў-мастакоў/творцаў у паэме Я. Коласа «Сымон-музыка» і навеле Э.Т.А. Гофмана «Церковь иезуитов в Г.».
29. Вобраз *дому* ў нацыянальных літаратурах (аўтары і творы на выбар).
30. Матыў *шляху* ў нацыянальных літаратурах (Я. Колас «Новая зямля» і Я. Купала «Раскіданае гняздо» і інш.).
31. Матыў *наканаванасці лёсу* ў нацыянальных літаратурах (В. Быкаў «У тумане», Э. По «Падение дома Ашеров» і інш.)
32. Пераклады М. Багдановіча, А. Лойкі з П. Верлена (творы на выбар)
33. Вобраз *гаспадара* ў нацыянальных літаратурах (аўтары і творы на выбар).

34. Літаратурная класіка ў параўнальным вывучэнні (на ўзроўні сатырычных вобразаў (аўтары і творы на выбар)).
35. Вобраз *гаспадара/гаспадыні* ў нацыянальных літаратурах (аўтары і творы на выбар).
36. Аналіз паэтычных перакладаў з беларускай на рускую мову і наадварот (2 вершы на выбар).

## КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*10 (дзесяць) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі;

поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне вольна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;

творчая самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*9 (дзевяць) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

сістэматычная, актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*8 (восем) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*7 (сем) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

вольнае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*6 (шэсць) балаў, залічана:*

дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*5 (пяць) балаў, залічана:*

дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў.

*4 (чатыры) балы, залічана:*

дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім ацэнку;

праца пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў.

*3 (тры) балы, незалічана:*

недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выклад адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;

слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

*2 (два) балы, незалічана:*

фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

*1 (адзін) бал, незалічана:*

адсутнасць ведаў (і кампетэнцый) у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, адмова ад адказу, адсутнасць на атэстацыі без уважлівай прычыны.

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
па вывучаемай дысцыпліне
з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці

| Назва дысцыпліны, вывучэнне якой звязана з дысцыплінайрабочай праграмы | Кафедра, якая забяспечвае вывучэнне гэтай дысцыпліны | Прапановы кафедры аб зменах у змесце рабочай праграмы | Прынятае рашэнне кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Сусветная літаратура XVII-XIX ст.», | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы «Гісторыя сусветнай літаратуры і беларуская літаратура» выкарыстоўваць матэрыял па « Сусветная літаратура XVII-XIX ст » | пратакол № 4 ад 22.11.2023 г. |
| « Гісторыя беларускай літаратуры 20-30-х гадоў XXст.» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы «Літаратурныя эпохі ў тыпалагічным асвятленні» абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па « Гісторыя беларускай літаратуры 20-30-х гадоў XXст » | пратакол № 4 ад 22.11.2023 г. |
| «Тэорыя літаратуры» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Больш шырока выкарыстоўваць літаратуразнаўчыя тэрміны і паняцці | пратакол № 4 ад 22.11.2023 г. |